А.І.Фядорына,
І.М.Стрыжонак,
ст. выкладчыкі Беларускага універсітэта культуры

# ВУЧЭБНА-АЗНАЯМЛЕНЧАЯ ПРАКТЫКА ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПАЧАТКОВАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ ФБІС

Пачатковай формай сувязі вучэбнага працэсу з практыкай работы бібліятэк з'яўляецца арганізацыя і правядзенне вучэбна-азнаямленчай практыкі студэнтаў II курса ФБІС, якая звязана з вывучэннем аднаго з бібліятэказнаўчых курсаў "Бібліятэчная справа: тэорыя" або "Бібліятэказнаўства: агульны курс". Вучэбная практыка ўводзіць студэнтаў у прафесію, знаёміць з накірункамі і асаблівасцямі дзейнасці бібліятэк розных тыпаў і відаў, што спрыяе фарміраванню прафесійнай арыентацыі студэнтаў.

Аб уплыве вучэбнай практыкі на развіццё цікавасці студэнтаў да сваёй прафесіі сведчаць вынікі праведзенага намі ў снежні 1999 г. анкетавання студэнтаў 201 — 209-й груп ФБІС. Усяго было апытана 72 % студэнтаў II курса. З 50 % ад агульнай колькасці рэспандэнтаў, якія напісалі, што іх не цікавіць прафесія бібліятэкара і паступілі яны ва універсітэт, каб атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі, 35 % пасля праведзеных экскурсій у бібліятэкі адзначылі ўзніклую цікавасць і прывабнасць да прафесіі бібліятэкара. А амаль 85 % усіх рэспандэнтаў адзначылі, што правядзенне экскурсій ў бібліятэкі станоўча ўздзейнічалі на фарміраванне іх інтарэсу да будучай прафесіі.

Аптымізацыя вучэбнай практыкі залежыць ад яе арганізацыі і кіраўніцтва. Кафедра бібліятэказнаўства ажыццяўляе значную работу па вучэбна-метадычным кіраўніцтве практыкай, якая ўключае тры этапы.

На першым (падрыхтоўчым) этапе разглядаецца і зацвярджаецца на кафедры праграма практыкі, састаўляецца каляндарны план-графік яе. Кіраўнік практыкі праводзіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструктаж выкладчыкаў з мэтай распрацоўкі і ўдасканалення адзіных прынцыпаў і методыкі правядзення практыкі. Выкладчыкі знаёмяць студэнтаў з праграмай практыкі, каляндарным планам-графікам яе праходжання, з рабочай дакументацыяй па практыцы.

Аб якасці правядзення падрыхтоўчага этапу залежыць далейшы ход практыкі.

На другім этапе праводзяцца экскурсіі ў бібліятэкі розных тыпаў і відаў г.Мінска. Для кожнай спецыялізацыі прадугледжаны свае базы практыкі. Усе бібліятэкі ўмоўна падзелены на дзве групы, абавязковыя для наведвання студэнтамі ўсіх спецыялізацый. У ходзе экскурсій студэнты вывучаюць гісторыю, стан, асаблівасці дзейнасці бібліятэк, знаёмяцца з іх структурай, кантынгентам чытачоў, арганізацыяй фондаў, даведачна-пошукавым апаратам і іншымі накірункамі.

На трэцім (заключным) этапе аналізуюцца дзённікі студэнтаў, прымаецца залік, на пасяджэнні кафедры заслухоўваецца справаздача адказнага за практыку, распрацоўваюцца рэкамендацыі па далейшым удасканаленні правядзення практыкі. Усе пералічаныя этапы практыкі ўзаемазвязаны, выкананне наступнага патрабуе абавязковага ажыццяўлення папярэдняга, што акцэнтуе работу як кіраўнікоў практыкі, так і студэнтаў на паслядоўнасць і стабільнасць на працягу ўсяго перыяду праходжання практыкі. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі вынікаў вучэбнай практыкі з'яўляюцца ўзровень выкарыстання тэарэтычных ведаў па курсе "Бібліятэказнаўства", а таксама ўзровень тэарэтычнага асэнсавання асаблівасцей дзейнасці бібліятэк розных відаў на занятках і экзамене па дысцыпліне "Бібліятэказнаўства: агульны курс".

Выкарыстоўваюцца такія метады праверкі вынікаў практыкі, як аналіз дзённікаў студэнтаў, апытанне студэнтаў на заліку па практыцы, у ходзе якога назіраецца спалучэнне ведаў аб канкрэтна-практычных аспектах дзейнасці бібліятэк з агульнатэарэтычнымі праблемамі бібліятэказнаўства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разам з тым існуе шэраг пытанняў, вырашэнне якіх будзе садзейнічаць лепшай арганізацыі вучэбнай практыкі студэнтаў.

1. Неабходна ўдасканаленне метадычнага забеспячэння вучэбнай практыкі. Справа ў тым, што праграму практыкі друкуюць у 4 — 5-і экземплярах, і не ўсе кіраўнікі практыкі яе маюць. Акрамя таго, трэба прадстаўляць праграму і бібліятэкам-базам практыкі, каб яны ведалі, якія пытанні дзейнасці бібліятэк неабходна раскрыць больш дэталёва.

2. Мэтазгодна, на наш погляд, павелічэнне працягласці вучэбнай практыкі. Некалькі экскурсій у бібліятэкі можна арганізаваць ужо на I курсе ў мэтах выкладання дысцыпліны "Уводзіны ў спецыяльнасць". Паглыбленне зместу вучэбнай практыкі на II курсе можна праводзіць праз далучэнне студэнтаў да выканання некаторых тэхналагічных аперацый непасрэдна ў бібліятэках, куды яны прыйшлі на экскурсіі. Наклейка лісткоў тэрмінаў звароту, афармленне фармуляраў кнігі, штэмпеляванне дакументаў і іншыя аперацыі дазволяць студэнтам адчуць сваё дачыненне да выканання прафесійных абавязкаў бібліятэкара і ўзбудзіць пэўную цікавасць да будучай прафесіі.

3. Кіраўнікам практыкі неабходна на заліку засяродзіць увагу на ўзроўні асэнсавання, авалодання інфармацыйнымі матэрыяламі, атрыманымі ў ходзе экскурсіі, на ўменні студэнта звязаць гэты матэрыял з тэорыяй бібліятэчнай справы.

4. Курс "Бібліятэчная справа: тэорыя" вывучаецца не толькі на стацыянары, але і на I курсе факультэта завочнага навучання, таму было б мэтазгодна для студэнтаў I курса ФЗН на ўстаноўчай сесіі (у верасні) арганізаваць экскурсіі ў буйныя універсальныя і галіновыя бібліятэкі г. Мінска, што прадстаўляе пэўную цікавасць для студэнтаў-завочнікаў, якія прыехалі з невялікіх гарадоў і вёсак рэспублікі.

5. Удасканаленню, у тым ліку і вучэбнай практыкі, садзейнічалі б міжуніверсітэцкія семінары або канферэнцыі па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадычных і арганізацыйных пытаннях практыкі, да якіх маглі б далучацца інстытуты, універсітэты, акадэміі культуры краін блізкага замежжа і на якіх адбыўся б цікавы абмен як вопытам работы, так і метадычнымі матэрыяламі па практыцы.

Вучэбная практыка — гэта першае далучэнне студэнтаў да іх будучай прафесійнай дзейнасці. Ад таго, наколькі цікава і паспяхова яна пройдзе, залежыць далейшае развіццё і паглыбленне прафесійнай арыентацыі студэнтаў.

Н.С.Церская,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

## ПРАКТЫКА ЯК АДНА З АСНОЎНЫХ ФОРМАЎ МЭТАВАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

Вялікая роля ў набыцці ведаў адводзіцца практыцы (вучэбнай, вытворчай, педагагічнай).

Практыка, арганізаваная сумеснымі сіламі кафедры і базы-ўстановы, дазваляе плённа вырашаць шэраг задач прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў. Назавём некаторыя з іх:

— паглыбленне, прафесійнае асэнсаванне, замацаванне фундаментальных агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў, якія трэба ўлічваць пры вырашэнні арганізацыйных і метадычных пытанняў навучання;

— развіццё здольнасцей, імкнення да самастойнага набыцця ведаў і навыкаў, неабходных для выканання прафесійных абавязкаў;

— фарміраванне навыкаў і уменняў апераваць ведамі, атрыманымі ў працэсе навучання;

— адаптацыя і падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійнай дзейнасці.

Як форма навучання практыка з'яўляецца вядучай фор-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ